# Усходняе партнёрства і грамадзянская супольнасць Беларусі

Прайшло каля паўгода ад таго моманту, калі 7 траўня 2009 года ў Празе адбыўся ўстаноўчы саміт Усходняга партнёрства (УП) - новай ініцыятывы Еўразвязу, якая павінна спрыяць эканамічнаму і палітычнаму збліжэнню з Еўропай і паступовай еўраінтэграцыі шасці постсавецкіх рэспублік: Украіны, Малдовы, Беларусі, Грузіі, Азербайджана і Арменіі. Сярод перспектыў для “усходніх партнёраў” - уцягванне нацыянальных эканомік у адзіны еўрапейскі рынак, далучэнне да адзінай сістэмы калектыўнай бяспекі і агульнай энергетычнай сеткі, памяншэнне вартасці і паступовая адмена віз. Бюджэт праграмы на 2010-2013 гады - 600 млн еўра.

Пэўны час у Беларусі Усходняе партнёрства разглядалася, як механізм нейкіх прэферэнцый для ўладных структураў у абмен на зрухі ў дэмакратызацыі беларускага грамадства.

На самай справе Усходняе партнёрства — шматбаковы механізм супрацоўніцтва, прапанаваны з боку Еўразвязу названым шасці дзяржавам Усходняй Еўропы і Закаўказзя. Адмысловая роля ў рамках праграмы адводзіцца пытанням грамадзянскай супольнасці ў кожнай з краінаў. Менавіта з гэтай мэтай 16-17 лістапада ў Брусэлі прайшоў I форум грамадзянскай супольнасці “Ўсходняга партнёрства”.




На арганізацыйным паседжанні ў Менску, тэма якога вызначалася як “Форум грамадзянскай супольнасці “Усходняга партнёрства”: парадак дня для Беларусі”, арганізатары паведамілі: форум выклікаў надзвычай в-лікі інтарэс з боку няўрадавых арганізацый. Калі з большай ва ўсіх адносінах Украіны паступілі 62 заяўкі, то ад Беларусі — 76. У выніку задаволена 27 просьбаў. Усяго ж на форум было запрошана 220 арганізацый з 6 краін.

У адным з пунктаў устаноўчай дэкларацыі “Ўсходняга партнёрства” гаварылася аб неабходнасці развіваць і падаваць метады для заснавання Форума грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства. У чэрвені 2009 года Еўракамісія запрасіла ўсе зацікаўленыя бакі да ўдзелу ў гэтым Форуме, прыярытэтная задача якога - умацаванне кантактаў і дыялогу паміж арганізацыямі грамадзянскай супольнасці і органамі самакіравання.

Прадугледжваецца, што Форум будзе засядаць як мінімум раз у год на рэгулярных сесіях або канферэнцыях, падтрымліваць рэалізацыю кірункаў праграмы Ўсходняга партнёрства ЕЗ, а таксама супрацоўнічаць з адпаведнымі структурамі ЕЗ.

Праект прадугледжаны для арганізацый, якія ўтвараюць грамадзянскую супольнасць, у шырокім сэнсе слова, гэта значыць для прафсаюзаў, гандлёвых асацыяцый, няўрадавых арганізацый (НУА-НДА), экспертных і навуковых арганізацый (“think-tank”), фондаў, а таксама для рэгіянальных і міжнародных аб’яднанняў пералічаных арганізацый з дзяржаў - удзельнікаў Усходняга партнёрства, як і з краін - чальцоў ЕЗ і іншых міжнародных арганізацый і аб’яднанняў.

*Яраслаў Грынкевіч, паводле СМІ.*

# “Каты ¨зафа Ратцынгера” ў Лідзе



18 лістапада ў Лідскай бібліятэцы імя Я. Купалы ў канферэнцзале адбылася прэзентацыя кнігі “Каты ¨зафа Ратцынгера” вядомага гарадзенскага пісьменніка Сяргея Астраўца.

Сустрэча пачалася з цёплых слоў госця ў адрас Ліды: “Мне вельмі падабаецца Ліда, і я вельмі рады таму, што выпала такая магчымасць прыехаць сюды зноў”. Прадмову і знаёмства з прысутнымі зрабіў паэт, намеснік старшыні Лідскай гарадской арганізацыі ТБМ Міхась Мельнік. Ен жа першым і выказаў словы падзякі празаіку за ўдзел у мерапрыемстве.

Бацька Сяргея Астраўца – былы вайсковец, жыве ў Лідзе, маці працавала ў музеі горада. Але ж сам пісьменнік нарадзіўся ў Менску, там жа скончыў факультэт журналістыкі, па размеркаванні трапіў у Гародню, дзе і жыве з 1984 года па сённяшні дзень. Гэты таленавіты чалавек піша прозу, тэксты для газет і радыё, выдае кнігі.

Аўтар пачаў гутарку з расповеду пра свой любімы горад - Гародню. З гонарам ён расказваў усім прысутнічым пра прыгажосць яго будынкаў і ўтульнасць вуліц, пра месцы, што цешаць яго вока, і ў якіх ён так любіць бываць. Гэта прывязаннасць адлюстроўваецца і ў творчасці пісьменніка – не мала сваіх твораў ён прысвяціў гэтама старжытнаму гораду, пераважная іх колькасць прыпадае на першыя гады працы журналіста ў газеце “Гродзенская праўда”. Менавіта ў ёй гэтыя творы і знайшлі сваіх першых чытачоў. Даволі дакладна С. Астравец пазнаёміў гасцей з новым выданнем. Аўтар сам зачытваў адрыўкі з тэкстаў, надрукаваных у кнізе, каментаваў іх, адзначаў любімыя радкі. Былі зачытаны таксама каментары да кнігі такіх знакамітых пісьменнікаў, як Адам Глёбус, Наталка Бабіна і Мікола Ваўранюк.

Трэба адзначыць, што творы, склаўшыя зборнік, вельмі разнапланавыя – гэта апавяданні, эсэ, зацемкі і рэпартажы. Наогул, кніга “Каты Езафа Ратцынгера” – гэта зборнік выбранных твораў, якія былі надрукаваны у газеце “Наша Ніва” з 1991 па 2007 год.

Сяргей Астравец - вельмі дасведчаны пісьменнік. На сённяшні дзень ён з’яўляецца аўтарам некалькіх кніг. Сярод іх - “Янычары”, выдадзеная у 1993 годзе і “Кактэйль Молатава” - у 2006 годзе. Сёлета пісьменнік напісаў яшчэ адзін твор, прысвечаны апошняму польскаму каралю – Станіславу Аўгусту Панятоўскаму. “Многія асуджаюць гэтую асобу, але я з’яўляюся яго прыхільнікам. Мяне вельмі цікавіць гэты дзеяч”, – гаворыць С. Астравец.

Напрыканцы прэзентацыі, ён яшчэ раз выказаў словы падзякі за сустрэчу і цёплы прыём, а пасля падпісаў усім ахвочым кнігі.

***Юля Грыб.***

**На здымку:** *Сяргей Астравец і Міхась Мельнік.*

# Мясцінамі Адама Міцкевіча

Удзельнікі сустрэчы з вучоным, эколагам, аматарам роварных вандровак па Беларусі Вячаславам Раковічам выправіліся 17-га лістапада 2009 г. ў завочнае падарожжа па мясцінах знакамітага паэта Адама Міцкевіча.





Кожны з прысутных не проста пабачыў маляўнічыя мясціны Беларусі, звязаныя з імем славутага творцы, але і меў добрую магчымасць прасачыць па карце маршрут, занатаваць назвы мястэчак і вёсак. Спадар Вячаслаў, добра ведаючы гісторыю жыцця Адама Міцкевіча, прапанаваў два маршруты. Адзін пачынаецца з Завосся, уключае Навагрудчыну з возерам Свіцязь, а другі ляжыць праз Ліду, Больценікі і захоплівае іншыя населеныя пункты, якія звязаны з рамантычнай постацю вялікага паэта.

Падарожжа атрымалася змястоўным, і падчас яго правядзення прысутныя няўзнак выйшлі на пытанне: чаму беларусы (а гэты значыць усе мы) так спакойна ў адрозненне ад іншых народаў ставяцца да сваіх славутых творцаў, якія складуць гонар любой нацыі? Зразумела, што пытанне, на якой мове пісаў Адам Міцкевіч, вельмі важнае, але гэтым усю праблему не абмяжуеш. Відавочна, што патрэбна вялікая асветніцкая праца, сярод моладзі ў першую чаргу, каб гэты геній, а ўслед за ім і іншыя імёны нашай гісторыі,якія ўжо ўваходзяць у культурную залатую скарбонку нашых суседзяў, занялі сваё годнае месца ў духоўным “іканастасе” кожнага беларуса. Для маладых людзей, якія прыйшлі на гэтую сустрэчу, шлях да Адама Міцкевіча ўжо пачаўся, і хочацца верыць, што пасля вандроўкі ён стане для іх больш зразумелым, а яго імя – дарагім.

Праект “Дыялог” працягвае сваю хаду. Мы запрашаем усіх ахвочых далучыцца да яго імпрэзаў, пашырыць свой кругагляд, падзяліцца сваімі ведамі і досведам, паўдзельнічаць у падрыхтоўцы свят і ў дыскусіях.

*Кіраўнік праекта “Дыялог”, намеснік старшыні ТБМ* ***Алена Анісім.***

# Беларускай мовай па грыпу

У горадзе Лідзе актывіты ГА “ТБМ” раздавалі мінакам ватна-марлевыя павязкі шматразовага карыстання і ўлёткі з пажаданнямі добрага здароўя і кароткімі правіламі карыстання гэтымі павязкамі. Таксама адзначалася, што “лепшымі лекамі ад хваробы душы, якая называецца “Іван без роду і племені” была, ёсць і будзе беларуская мова.”





Людзі, атрымаўшыя павязкі, рэагавалі на гэта ўсмешкамі і падзякамі. Шмат хто адказваў па-беларуску.

Як сказаў сябар Лідскай гарадской рады ГА ТБМ Кірыл Сыцько: “У мерапрыемствах Таварыства беларускай мовы не хапае арыгінальнасці - іх кола звузілася, лічы, да збораў подпісаў і літаратурных ці культурніцкіх вечарынаў, а таксама вандровак. З першым, здаецца, усё зразумела, а вось на вечарынах і вандроўках прысутнічаюць адныя і тыя ж людзі. Некаторыя могуць сказаць, што мова маргіналізуецца, але гэта не так проста працуем не эфектыўна. Як не раз адзначаў Алег Дзьячкоў з Магілёва, з-за ўласнай ляноты і дурноты на сённяшні дзень праца ідзе не так, як хацелася б. Я ад сябе яшчэ магу дадаць, што не хапае новых, крэатыўных ідэй, маладога агеньчыку.”

***Наш кар***